Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 4. С. 103–107.

*УДК 821.161.3:37.091.39*

# ВЫКАРЫСТАННЕ СУЧАСНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ НА ЎРОКУ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**І. М. Гоўзіч,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ;*

**М. С. Рак,**
*магістр педагагічных навук, БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 11.07.18.

*UDC 821.161.3:37.091.39*

# THE USE OF MODERN EDUCATIONAL TECHNOLOGY AT THE LESSONS OF BELARUSIAN LITERATURE

**I. Houzich,**
*PhD in Philology, Associated Professor, the Head of the Department of the Belarusian and Foreign Literature, BSPU;*

**M. Rak,**
*Master of Pedagogics, BSPU*

Received on 11.07.18.

У артыкуле адзначаецца, што методыка і тэхналогія навучання літаратуры ў сучаснай адукацыйнай парадыгме скіроўваюць настаўніка да пошуку найбольш эфектыўных форм, прыёмаў і спосабаў рэпрэзентацыі і рэалізацыі зместу літаратурнай адукацыі, якія павінны фарміраваць вопыт самастойнай дзейнасці вучняў па прымяненні ведаў у новай сітуацыі. Даецца вызначэнне і характарыстыка асноўных сучасных адукацыйных тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць на ўроку літаратуры.

*Ключавыя словы:* тэхналогія, асобасна арыентаваны падыход, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення, французская педмайстэрня, модульнае навучанне, Дальтон-план, тэхналогія праектнага навучання, камп'ютарныя тэхналогіі.

The article notes that the methodology and technology of literary education in the modern educational paradigm directs the teacher to find the most effective forms, methods and ways of representation and realization of the content of literary education, which should form the experience of independent activity of pupils in the application of knowledge in new situations. The definition and characteristics of the main modern educational technologies that are appropriate to use in the classroom literature are given.

*Keywords:* technology, student-centered approach, technology of development of critical thinking, the French educational workshop, module teaching, Dalton Plan, the technology of project-based learning, computer technologies.

На найноўшым этапе развіцця літаратурнай адукацыі актывізуецца ўвага настаўнікаў да сучасных адукацыйных тэхналогій – сістэмы педагагічнай дзейнасці па пэўным алгарытме з мэтай засваення вучнямі зместу адукацыі. Як неаднаразова адзначалася, «традыцыйныя тэхналогіі пераважна зводзіліся да пераносу інфармацыі, ведаў. Настаўнік, падручнікі – крыніца, аб'ект – вучань. Традыцыйныя тэхналогіі распрацоўваліся на аснове рэпрадуктыўна-інфармацыйнага падыходу, новыя – заснаваны на падыходзе эўрыстычна-даследчым, праблемным. У новых тэхналогіях змяняецца функцыя настаўніка: дамінуючай становіцца не інфармацыйная, а рэгулюючая, функцыя кіравання пазнавальным працэсам, яго псіхалагізацыя (стварэнне праблемных сітуацый, пабудова ўрокаў па прынцыпе лагічных, мысліцельных заданняў). Вялікая ўвага ў новых тэхналогіях надаецца алгарытмізацыі, распрацоўцы і прымяненню апорных схем, сігналаў, табліц, картак, малюнкаў і г. д.» [1, с. 49].

Выбар найбольш аптымальнай тэхналогіі, прыдатнай для выкарыстання на тым ці іншым уроку беларускай літаратуры, абумоўліваецца наступнымі фактарамі: 1) зместам мастацкага твора, яго жанравай, тэматычнай і вобразнай спецыфікай; 2) этапам вывучэння; 3) узростам і індывідуальнымі асаблівасцямі вучняў; 4) падрыхтаванасцю настаўніка і абсталяванасцю ўстановы адукацыі; 5) мэтамі навучання і траекторыяй, якую выбірае ў сваёй дзейнасці педагог. Пра выбар і «нараджэнне» тэхналогій вядуцца няспынныя дыскусіі, але правільна і дарэчна заўважана, што «адказ на гэта пытанне і просты і складаны адначасова. Сама задума майстэрні, яе тэмы і звышзадачы – гэта момант натхнення, азарэння ідэяй, жаданнем будаваць размову з вучнямі-чытачамі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

або студэнтамі-філолагамі як з роўнымі ў творчым пошуку і магчымасці адкрыцця мастацкіх тэкстаў, светаразумення аўтараў» [2, с. 104].

Аднымі з самых цікавых і карысных сучасных адукацыйных тэхналогій, якія паспяхова выкарыстоўваюцца на ўроку літаратуры, з'яўляюцца наступныя: тэхналогія развіцця крытычнага мыслення, французская педмайстэрня, модульнае навучанне, Дальтон-план, тэхналогія праектнага навучання, камп'ютарныя тэхналогіі (QR-коды, адукацыйныя веб-квэсты, буктрэйлеры) і інш.

*Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення* мае на ўвазе непарыўную сувязь з логікай, варыятыўнасць мысленчых дзеянняў, імкненне да глыбокіх ведаў, развіццё аналітычнага мыслення, і рэалізуецца ў наступных узаемазвязаных этапах:

1) стадыя выкліку (абуджэнне цікавасці да тэмы) дазваляе актывізаваць веды па тэме, выклікаць устойлівую цікавасць да вывучаемага матэрыялу, матываваць школьнікаў да вучэбнай дзейнасці. На ўроку літаратуры ў V–VIII класах на гэтым этапе мэтазгодным стане выкарыстанне займальнага матэрыялу (міні-гульняў, віктарын, крыжаванак), а ў IX–XI – праблемных пытанняў і заданняў;

2) этап актуалізацыі ведаў вымагае настаўніка скіравацца да выкарыстання прыёму «праўдзівых і непраўдзівых сцвярджэнняў», пры правядзенні якога прапануецца 5–6 сцвярджэнняў. Задача вучняў вызначыць іх праўдзівасць (знакам «+») ці непраўдзівасць (знакам «–»), у тых выпадках, дзе ёсць сумненні ў правільнасці адказу, ставіцца пытальны знак («?»), апошняя графа табліцы запаўняецца на стадыі рэфлексіі.

| № п/п | Сцвярджэнні | Пачатак заняткаў | Канец заняткаў |
|---|---|---|---|
| 1 | Васіль па-сапраўднаму ніколі не кахаў Ганну (І. Мележ «Людзі на балоце») | + | – ? |

З мэтай выяўлення агульных і адрозных рыс можна выкарыстаць дыяграму Вена, якая складаецца з двух акружнасцей, якія перасякаюцца. У перасячэнні плоскасцей акружнасцей адлюстроўваецца агульнае, што ўласціва двум аб'ектам, а ў паўакружнасцях фіксуецца тое, што характэрна для кожнага аб'екта.



Напрыклад, вучням у V–VIII класах можна прапанаваць параўнаць вершы, падобныя па тэме (У. Караткевіч верш «Бацькаўшчына» і Я. Крупенька верш «Ёсць у кожнага з нас») ці герояў невялікага твора (А. Васілевіч апавяданне «Сябры»), а ў IX–XI – герояў рамана І. Мележа «Людзі на балоце» ці аповесці В. Быкава «Знак бяды».

Адным з прыкладаў актуалізацыі ведаў па вывучаемай тэме з'яўляецца прыём «Выклік па ключавых словах», калі настаўнік прапануе ўзнавіць матэрыял на аснове слоў, узятых з тэксту: «мае рознакаляровыя вочы», «вострая на язык», «стары, учэпісты» (І. Мележ «Людзі на балоце»);

3) этап асэнсавання, на якім арганізуецца самастойная работа з новай інфармацыяй. Напрыклад, у межах метадычнага прыёму «Думай – Дзяліся на пары – Дзяліся думкамі» вучням прапануецца пытанне па тэме заняткаў («Ці стане Васіль падобным на старога Карча?», І. Мележ «Людзі на балоце»), над якім яны разважаюць індывідуальна, пасля чаго дзеляцца на пары і параўноўваюць свой адказ з адказам партнёра, а пасля прэзентуюць вынікі разваг класу.

На наш погляд, адным з эфектыўных спосабаў графічнай арганізацыі матэрыялу на дадзеным этапе з'яўляецца «Кластар» – выдзяленне сэнсавых адзінак тэксту і іх графічнае афармленне ў пэўным парадку ў выглядзе гронкі:




4) этап рэфлексіі – аналіз, творчая перапрацоўка, інтэрпрэтацыя атрыманай інфармацыі (індывідуальна, у парах, у групе), на якім увага звяртаецца на першапачатковыя палажэнні, уносяцца змены, дапаўненні, даюцца творчыя, практычныя або даследчыя заданні на аснове вывучанай інфармацыі. Вучні павінны суаднесці «новую» інфармацыю са «старой», прааналізаваць і перапрацаваць яе, выказаць уласны погляд на праблему. Гэта дасягаецца з дапамогай наступных прыёмаў: сінквейны, канцэптуальныя табліцы, вяртанне да ключавых слоў, напісанне творчых работ (эсэ, тэлеграм, інтэрв'ю), складанне і афармленне анталогій.

Цікавай і эфектыўнай формай арганізацыі рэфлексіі з'яўляецца складанне сінквейна, які служыць для сінтэзу і абагульнення складанай інфармацыі, узбагачае слоўнікавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

запас, дапамагае творчаму самавыяўленню. Алгарытм напісання сінквейна наступны:

Назва
Два азначэнні
Тры дзеясловы
Сказ з чатырох слоў
Сінонім (ці асноўная думка) назвы

Эфектыўным будзе выкарыстанне прыёму «Канцэптуальная табліца» пры параўнанні некалькіх меркаванняў, напрыклад, пры пошуку адказу на пытанне, якое ставіць І. Мележ перад героямі рамана «Людзі на балоце»: у чым сэнс жыцця чалавека, яго асноўнае прызначэнне?

| Васіль | Ганна | стары Корч | Ячхім | Апейка | Асабістае меркаванне |
|---|---|---|---|---|---|

Тэхналогія педагагічных майстэрняў была распрацавана ў Францыі, «яе падмурак заклалі вядомыя псіхолагі і грамадскія дзеячы Анры Валлон, Поль Ланжэвен і Жан Піяжэ. Яны і іх паслядоўнікі – французская група новай адукацыі (GFEN – groupe fransais education nouvelle), якая аб’ядноўвае тысячы педагогаў, – мяркуюць, што прагрэсіўныя трансфармацыі ў грамадстве стымулююцца староўчымі зменамі ў адукацыі. Майстэрні будуюцца ў адпаведнасці з «простымі і зразумелымі формуламі»: дзіця павінна само шукаць веды; праца вучня павінна мець сэнс; усе здольныя; дзіця павінна рухацца; дзеці любяць працаваць рукамі» [3, с. 184].

Майстэрня – форма правядзення вучэбных заняткаў, якая складаецца з паслядоўнасці ўзаемазвязаных этапаў, на кожным з якіх вызначальным з’яўляецца адпаведнае вучэбнае заданне, якое накіроўвае пазнавальную дзейнасць школьнікаў. Выкананыя вучнямі заданні не правяраюцца настаўнікам, у класе арганізуецца самаправерка, самаацэнка, рэфлексія вынікаў працы і самога працэсу пазнання [3]. Асноўнымі этапамі майстэрні з’яўляюцца:

*Індукцыя* – арганізацыя настаўнікам праблемнай сітуацыі, стварэнне эмацыянальнага настрою, уключэнне асабістых адносін да прадмета абмеркавання і падсвядомасці дзіцяці.

*Самаканструкцыя* (індывідуальная праца) па пастаноўцы пытанняў, фармулёўцы мэт урока, ацэнцы сітуацыі, вылучэнні індывідуальных гіпотэз, выкананні мікрапраектаў, тлумачэнні фактаў і з'яў, рашэнні задач і г. д.

*Сацыяканструкцыя* (групавая праца) па выкананні заданняў майстра.

*Сацыялізацыя* – агульнае абмеркаванне зробленага індывідуальна, у парах або групах, разгляд усіх гіпотэз, думак, прапаноў, рашэнняў.

*Разрыў* – супастаўленне вучнямі сваіх індывідуальных і (або) групавых работ з навуковымі тэкстамі (культурна-гістарычнымі аналагамі) і ўсведамленне ўдзельнікамі майстэрні абмежаванасці сваіх ведаў.

*Рэфлексія* – працэс асэнсавання ўласнай дзейнасці, які перажываецца ў думках або ў адчуваннях.

*Панэль*: франтальнае абмеркаванне праблемы, што ўзнікла, калі ўдзельнікі выказваюцца па сутнасці новай праблемы, новага бачання аб’екта вывучэння, тых адчуванняў, якія ўзніклі на ўроку.

*Слова майстра*: педагог на майстэрні знаходзіцца нібы ў цяні, на розных этапах уроку ён умела кіруе працай вучняў з дапамогай заданняў.

*Творчасць* – стварэнне вучнямі новых адукацыйных прадуктаў [3].

Шырокае распаўсюджанне атрымала і тэхналогія модульнага навучання, якая больш актыўна выкарыстоўваецца пры вывучэнні мовы. М. В. Жуковіч адзначае, што «модульнае навучанне ўзнікла як альтэрнатыва традыцыйнаму яшчэ на пачатку 1960-х гадоў XX стагоддзя ў навучальных установах ЗША і Заходняй Еўропы. <…> Модульная тэхналогія адрозніваецца ад традыцыйнай і іншых асобасна-арыентаваных методык тым, што сам змест навучання звычайна прапануецца вучню ў выглядзе інфармацыйна закончаных блокаў» [4, с. 63]. Кожны модуль-блок уключае наступнае:

«– дакладна сфармуляваныя мэты і задачы;

– лагічна завершаны вучэбны матэрыял;

– банк інфармацыі (крыніцы, тэксты, літаратуры);

– метадычныя парады па дасягненні мэт;

– дакладнае планаванне і праектаванне ўрока і сістэмы ўрокаў;

– мікрамэты, формы справаздачнасці і крытэрыі адзнакі;

– кантрольныя пытанні, заданні, тэксты» [1, с. 52].

Асаблівасць модульнага навучання – рэйтынгавая ацэнка паспяховасці, пры якой для кожнага вучня заводзіцца тэхналагічная карта вывучэння модуля:

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| Тэма | Вынік | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | I узровень | II узровень | III узровень | IV узровень | V узровень |
| | 1–2 | 3–4 | 5–6 | 7–8 | 9–10 |
| Самакантроль | | | | | |
| Кантроль | | | | | |

Сутнасць *Дальтон-плана* заключаецца ў тым, што вучэбны матэрыял, акрэслены праграмай па літаратуры на год, дзеліцца «на колькасць навучальных тыдняў. Настаўнік складае план-графік урокаў-заданняў, крокаў[1] кансультацый і карэкцыі і выніковых заняткаў. Па тэме даецца заданне вучням для самастойнай працы, вызначаецца тэрмін выканання. Педагог выступае ў якасці кансультанта, кіруе самастойнай працай, затым праводзіць карэкцыйна-кантрольны ўрок або выніковую канферэнцыю. Вучань працуе самастойна. Справаздача аб вывучанай тэме праводзіцца ў вуснай або пісьмовай форме (даклады, рэфераты, сачыненні, эсэ і інш.). Настаўнік аналізуе, вызначае тыповыя недахопы, пра якія вядзецца гаворка на выніковых уроках» [1, с. 54].

Метад праектаў узнік у другой палове XIX стагоддзя ў сельскагаспадарчых школах ЗША і быў перанесены пасля ў агульнаадукацыйныя школы. Вылучаюцца наступныя віды праектаў: даследчыя, творчыя, ролевыя, практыка-арыентаваныя, інфармацыйныя.

*Даследчыя* праекты маюць структуру, набліжаную да навуковых даследаванняў. Яны павінны ўключаць аргументацыю актуальнасці тэмы, азначэнне праблемы, прадмета, аб'екта, мэт і задач даследавання. Абавязковым з'яўляецца вылучэнне гіпотэзы і метадаў даследавання, правядзенне эксперыменту. Падобны праект завяршаецца абмеркаваннем і афармленнем вынікаў, фармуляваннем высноў і вызначэннем праблем на далейшую перспектыву даследавання. Форма прэзентацыі вынікаў: навуковa даследчыя работы па літаратуры.

*Творчыя* праекты не маюць строгай структуры, аднак у іх можна вылучыць наступныя этапы: вызначэнне мэты, патрабаванняў да аб'екта праектавання, даследаванне, выпрацоўка першапачатковых ідэй, іх аналіз, планаванне, выраб, ацэнка (рэфлексія). Форма прэзентацыі можа быць рознай (відэафільм, свята, рэпартаж і інш.).

Пры *ролевых* праектах удзельнікі выконваюць вызначаныя ролі, абумоўленыя зместам праекта. Асноўны від дзейнасці ў такіх праектах – ролевая гульня: імітацыі сацыяльных і дзелавых адносін у розных сітуацыях, літаратурныя персанажы. Форма прэзентацыі вынікаў: інсцэніроўка, заняткі ў форме інтэрв'ю, рэпартажаў.

Мэта *інфармацыйных* праектаў – навучыць здабываць і аналізаваць інфармацыю, выкарыстоўваць розныя метады атрымання інфармацыі (літаратура, бібліятэчныя фонды, СМІ, базы дадзеных, у тым ліку электронныя) і яе апрацоўкі (аналіз, абагульненне, супастаўленне з вядомымі фактамі, аргументаваныя высновы). Інфармацыйныя праекты завяршаюцца прэзентацыяй (даклад, публікацыя).

*Практыка-арыентаваныя* праекты – гэта праекты з практычнымі вынікамі – газета, часопіс, інтэрнэт-партал.

Праектная папка (партфоліо) – адзін з абавязковых выхадаў праекта, якая прадяўляецца на абароне (прэзентацыі) праекта. Яе галоўная функцыя – паказаць ход працы праектнай групы. Акрамя таго, праектная папка дазваляе: арганізаваць працу кожнага ўдзельніка праектнай групы; стаць зручным даведнікам на працягу працы над праектам; аб'ектыўна ацаніць ход працы над завершаным праектам; меркаваць пра асабістыя дасягненні і росце кожнага ўдзельніка праекта на працягу яго выканання; зэканоміць час пры пошуку інфармацыі падчас падрыхтоўкі іншых праектаў, блізкіх па тэме.

☑У склад праектнай папкі ўваходзяць:
1) пашпарт праекта;
2) планы выканання праекта і асобных яго этапаў;
3) прамежкавыя справаздачы групы;
4) уся сабраная інфармацыя па тэме праекта, у тым ліку неабходныя ксеракопіі, раздрукоўкі і інш.;
5) вынікі даследаванняў і аналізу;
6) запісы ўсіх ідэй, гіпотэз і рашэнняў;
7) справаздачы аб нарадах групы, праведзеных дыскусіях, «мазгавых штурмах»;
8) кароткае апісанне ўсіх праблем, з якімі сутыкаліся ўдзельнікі праекта і спосабы іх пераадолення;
9) эскізы, чарцяжы, накіды;
10) матэрыялы да прэзентацыі;
11) іншыя рабочыя матэрыялы і чарнавікі групы.

[1] Нам здаецца, што трэба чытаць «урокаў».

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У напаўненні праектнай папкі прымаюць удзел усе ўдзельнікі групы, запісы павінны быць па магчымасці кароткімі, у форме невялікіх накідаў і анатацый. У дзень прэзентацыі праектаў аформленая папка здаецца ў журы.

*QR-коды* ўяўляюць сабой матрычныя коды, мініяцюрныя носьбіты дадзеных, якія захоўваюць тэкставую інфармацыю аб'ёмам да 3 тысяч байт, закадзіраваную з дапамогай спецыяльных праграм / сэрвісаў у выглядзе чорна-белых ці каляровых квадратаў. У іх можа быць прадстаўлена наступная інфармацыя: спасылкі на мультымедыйныя рэсурсы; рэпрадукцыі карцін і ілюстрацыі; тэарэтычныя паняцці; кантрольна-вымяральны і тэставы матэрыял (сеткавы сэрвіс ClassTools.net); дамашнія заданні; дадатковы матэрыял па творы.

Акрамя QR-кодаў на ўроку літаратуры можна выкарыстоўваць і *адукацыйныя веб-квэсты* – праблемныя заданні з элементамі ролевай гульні, падобныя да згаданых вышэй праектаў з адным выключэннем: для іх выканання патрабуецца выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў, а таксама буктрэйлеры – кароткія відэаролікі, якія рэкламуюць пэўную кнігу ці твор пісьменніка.

Такім чынам, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў вучэбным працэсе па беларускай літаратуры дазваляюць актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, дасягнуць больш якаснага засваення вывучаемага матэрыялу, акцэнтуючы ўвагу на якасці сфарміраваных ведаў, уменняў і навыкаў. Ажыццяўленне дыферэнцыраванага навучання ў працэсе вывучэння твораў навейшай беларускай літаратуры развівае патрэбу ў індывідуальна-творчай і даследча-пошукавай, аналітычнай дзейнасці школьнікаў.


*Літаратура*

1. *Руцкая, А. В.* Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А. В. Руцкая, М. В. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.
2. *Галицких, Е. О.* От сердца к сердцу : Мастерские ценностных ориентаций для педагогов и школьников : метод. пособие / Е. О. Галицких. – СПб. : Паритет, 2003. – 143 с.
3. *Запрудский, Н. И.* Современные школьные технологии : пособ. для учит. / Н. И. Запрудский. – 3-е изд. – Мінск : Сэр-Вит, 2006. – 288 с.
4. *Жуковіч, М. В.* Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапам. для настаўн. устаноў, якія забяспечв. атрыманне агул. сярэд. адукацыі / М. В. Жуковіч. – Мінск : Аверсэв, 2007. – 157 с.

*References*

1. *Rutskaya, A. V.* Metodyka vykladannya belaruskay litaratury : vucheb. dapam. / A. V. Rutskaya, M. V. Grynko. – Minsk : Izd-vo Grevtsova, 2010. – 184 s.
2. *Galitskikh, Ye. O.* Ot serdtsa k serdtsu : Masterskiye tsennostnykh oriyentatsiy dlya pedagogov i shkolnikov : metod. posobiye / Ye. O. Galitskikh. – SPb. : Paritet, 2003. – 143 s.
3. *Zaprudskiy, N. I.* Sovremennyye shkolnyye tekhnologii : posob. dlya uchit. / N. I. Zaprudskiy. – 3-ye izd. – Minsk : Ser-Vit, 2006. – 288 s.
4. *Zhukovich, M. V.* Suchasnyya pedagagichnyya tekhnalogii na urokakh belaruskay movy i litaratury : dapam. dlya nastaun. ustanou, yakiya zabyaspechv. atrymanne agul. syared. adukatsyi / M. V. Zhukovich. – Minsk : Aversev, 2007. – 157 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ